**Таццяна Падаляк**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# КАШТОЎНАСЦЬ ПУБЛІЦЫСТЫЧНАГА СЛОВА ЯК ЭМПІРЫЧНЫ ФАКТ

Доктар філалагічных навук прафесар Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч – выдатны навуковец-энцыклапедыст, прадстаўнік класічнай акадэмічнай школы мовазнаўства. Гэта і таленавіты, адметны педагог, адрознівала незвычайнае абаянне, дабрыня і спагадлівасць – невыпадкова вучні яго шчыра любілі і глыбока паважалі.

Аркадзь Іосіфавіч вучыў маладых журналістаў, апрача ўсіх тонкасцяў, нюансаў і таямніц роднай мовы, яшчэ і майстэрству дакладнасці

словаўжывання. У нашай прафесіі гэта, несумненна, мае надзвычай важнае значэнне

Прафесар А. Наркевіч часта заходзіў у рэдакцыю найстарэйшай беларускай газеты «Звязда» да нас, сваіх вучняў. І гэта ў многім сімвалічна. Таму што вялікая гісторыя газеты сведчыць, што ў экстрэмальных абставінах «пагранічнай сітуацыі» публіцыстычнае слова было не тое што на вагу золата, а літаральна на вагу жыцця. І гэта не прыгожая метафара, а эмпірычны факт. Журналісты ўласнымі жыццямі плацілі за магчымасць данесці да народа дакладнае слова праўды.

У год 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў урокі ваеннай «Звязды» і ўрокі прафесара Наркевіча асабліва актуальныя.

З першых дзён Вялікай Айчыннай «набатным заклікам гучала палымянае слова “Звязды”» [2, с. 20]. 23 чэрвеня 1941 г. газета выйшла на дзвюх старонках: заява Савецкага ўрада, баявыя зводкі, першыя законы ваеннага часу. Ужо ў нумары за 24 чэрвеня былі змешчаны першыя ваенныя вершы Якуба Коласа, Пятра Глебкі, Антона Бялевіча. Паэтычнае слова ўзмацняла, рабіла больш дзейсным і эфектыўным слова публіцыстычнае. Напрыклад, Якуб Колас у вершы «Шалёнага пса – на ланцуг» пісаў:

Дык так, пачалося. Забойца ў паходзе,
І спушчаны псы з ланцугоў.
У грознай навале, у цяжкай прыгодзе
Больш мірных няма берагоў.
Да зброі, народы раскутай краіны:
Разбойнік штурмуе наш дом!
Магутнаю раццю, патокам адзіным
Абрушым на ворага гром!
……………………………………
Дык чуйце, народы: ў паход на бандыта,
На меч перакуйце ваш плуг.
Захочам – і Гітлер, як пёс, будзе біты:
Шалёнага пса – на ланцуг!

23 чэрвеня, другі дзень Вялікай Айчыннай вайны: Мінск у агні, бамбёжкі не спыняліся, а рэдакцыя рыхтавала чарговы нумар газеты. Пісьменнік Павел Кавалёў, які працаваў у той час у «Звяздзе», успамінаў, што ў набор здавалася і публіцыстычнае выступленне Янкі Купалы, у якім «была фраза аб тым, што “вораг знойдзе сабе магілу на нашай зямлі”. Некаторыя з адказных супрацоўнікаў “Звязды” палічылі, што гэта месца трэба выправіць – бо ў даваенны час была думка, што мы ворага разгромім на яго ўласнай тэрыторыі» [3, с. 198]. Менавіта Кавалёву было даручана патэлефанаваць паэту і ўзгадніць праўку. Іван Дамінікавіч падрабязна расказаў маладому журналісту, што ён «укладвае вялікі сэнс у гэту сваю фразу: “вораг знойдзе сабе магілу на нашай зямлі”. Гаварыў, што вайна будзе цяжкою, што бітва будзе зацятаю. Паэт прасіў перадаць таварышам з рэдакцыі, што ён, нягледзячы на “заўвагу”, перакананы ў правільнасці сваёй думкі» [3, с. 198].



Янка Купала не памыліўся. Апошні легальны нумар «Звязды» ў вайну выйшаў 13 жніўня 1941 года ў Гомелі. А праз 9 месяцаў, ва ўмовах жорсткага фашысцкага тэрору, мінскія падпольшчыкі аднавілі выпуск газеты, якая напярэдадні Вялікай Айчыннай мела высокі аўтарытэт у чытачоў і была надзвычай папулярным выданнем, да голасу якога ўсе ўважліва прыслухоўваліся.

Першым рэдактарам падпольнай «Звязды» стаў Уладзімір Амельянюк. Вайна застала маладога журналіста ў Беластоку, дзе ён, студэнт Камуністычнага інстытута журналістыкі (КІЖа), праходзіў вытворчую практыку ў газеце. Шмат дзён прабіраўся ў Мінск, дзе адразу ўключыўся ў падпольную барацьбу. Яго найлепшы сябар Генадзь Будай, разам з якім працавалі ў дзяржынскай раённай газеце, потым у 1938-м сталі студэнтамі КІЖа, а летам 1941-га стваралі патрыятычнае падполле, успамінаў, што Валодзя валодаў «уменнем за нязначным, здавалася б, фактам, разглядзець важныя з’явы» [2, с. 20].

Уладзімір Амельянюк устанавіў сувязь з рабочымі друкарні Дома друку. Там стварылася адна з першых падпольных груп: бацька і сын Воранавы, наборшчыкі Барыс Пупко і Міхаіл Свірыдаў і прыбіральшчыца, былая настаўніца Броня Гофман. «Барыс Пупко ўсяляк імкнуўся заваяваць давер у самога нямецкага шэфа друкарні. І дабіўся свайго. Шэф, праходзячы па друкарні, часта падыходзіў да Барыса, размаўляў з ім, а іншы раз і паціскаў руку. Гэта значна аблегчыла работу адважнага камсамольца. Многія, лічачы Барыса Пупко любімчыкам шэфа, не маглі нават падумаць, што Барыс тут жа, стоячы ля сваёй касы, набіраў лістоўкі Мінскага падпольнага гаркама», – успамінаў Уладзімір Казачонак, адзін з удзельнікаў выдання падпольнай «Звязды» [4, с. 104]. Гэта не проста мужнасць – сапраўдны гераізм: літаральна пад носам у ворага набіраць словы змагання і барацьбы: «Нямецкія паліцэйскія сабакі… заклікаюць вас выдаваць у іх крывавыя лапы ўсіх верных свайму народу і Радзіме людзей… Не слухайце гэтых ганебных заклікаў акупантаў і іх памагатых. Уключайцеся ў актыўную барацьбу супраць нямецкіх захопнікаў.

Паведамляйце блізкім аб прысутнасці шпіёнаў і правакатараў… Ідзіце ў лясы, далучайцеся да атрадаў народных мсціўцаў – чырвоных партызанаў!» [4, с. 105].

Першы нумар «Звязды» падпольшчыкі вырашылі набіраць… непасрэдна ў друкарні Дома друку. Барыс Пупко займаўся наборам, бацька і сын Воранавы вынеслі з друкарні на сваю кватэру на тагачаснай Рымарнай вуліцы гранкі для вёрсткі газеты, прабельны матэрыял, вярстаткі, фарбу, валікі, паперу і іншыя матэрыялы, неабходныя для выпуску газеты. Яны ж па частках вынеслі і набор. Менавіта ў доме Воранавых 18 мая 1942 года быў аддрукаваны першы нумар падпольнай «Звязды» тыражом 2 500 экзэмпляраў. Ён адкрываўся наступным зваротам да чытачоў: «Таварышы! З сённяшняга дня Мінскі Гарком КП(б)Б аднаўляе выданне свайго органа – газеты “Звязда”. Пішыце ў газету аб жыцці партызанскіх атрадаў, аб баявой іх дзейнасці, аб паасобных партызанах, праявіўшых сябе ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Рэдкалегія». Газета-патрыётка яднала народ у імя Перамогі, заклікаючы: «Паднімайцеся ўсе, каму дорага наша Радзіма, на ўсенародную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў!» Кожнаму падпольшчыку было зразумела, што чакае ў выпадку правалу. Ніякіх ілюзій не было, людзі свядома рабілі свой выбар. Уладзімір Амельянюк пісаў: http://zvyazda.minsk.by/attachments/258/9-16_l.jpg«Партызан! Ты бачыш, на фронт цягнуцца нямецкія эшалоны, гружаныя салдатамі, боепрыпасамі і тэхнікай! Узрывай чыгуначнае палатно, масты, пушчай пад адкос саставы – гэтым ты палегчыш наступленне Чырвонай Арміі. Бачыш тэлефонны кабель – рві яго, гэтым перарэжаш сувязь і ўнясеш замяшанне ў асяроддзе ворага. Ты чуеш, па тваёй краіне крычаць салдаты і афіцэры гітлераўскай грабарміі! Знішчай іх як шалёных сабак! Радзіма толькі тады ўздыхне свабодна, калі на яе зямлі не застанецца ніводнага акупанта» (Звязда, 1942, № 1).

Для гітлераўцаў выхад падпольнай газеты «Звязда» быў падобны да выбуху магутнай бомбы.

Слова было – на вагу золата. «Невялікая па памеру газетная плошча прымушала пісаць вельмі лаканічна, і ўсё ж звяздоўцы-падпольшчыкі імкнуліся зрабіць кожны нумар цікавым, змястоўным, выкарыстоўвалі розныя газетныя жанры», – справядліва адзначаў М. Дастанка [2, с. 167]. У час вайны даследчык рэдагаваў слуцкую падпольную газету «Народны мсцівец»: ён выдатна ведаў, што журналістам-падпольшчыкам даводзілася працаваць у вельмі складаных умовах, рыхтаваць матэрыялы «на хаду».



Генадзь Будай у кнізе «Свінцом і словам», якая вытрымала не адно выданне, пісаў: «Час сцірае вастрыню ўспрымання фактаў, падзей. Гледзячы на пажоўклы газетны лісток, не ўсе сёння ўяўляюць, які подзвіг здзяйснялі людзі, выпускаўшыя газету ў горадзе, дзе ўладарыў жорсткі фашысцкі тэрор» [1, с. 97].

Красамоўная дэталь, на якую звяртаецца ўвага: Уладзімір Амельянюк спяшаўся, рыхтуючы матэрыялы для першага нумара падпольнай «Звязды». А як працаваў над фактам і словам: «Яго блакнот папаўняўся фактамі аб баявых дзеяннях народных мсціўцаў, аб зверствах фашыстаў. Скрупулёзна адбіраў ён найбольш важныя паведамленні Маскоўскага радыё… Шмат якую інфармацыю хацелася змясціць у маленькім газетным лістку. Але трэба было “сціскаць”, і Амельянюк па некалькі разоў перапісваў матэрыялы, стараўся ўдыхнуць у іх жар свайго сэрца, усю нянавісць да ворага» [1, с. 78].

За кожнае слова праўды патрыёты плацілі сваімі жыццямі: Барыс Пупко, Міхаіл Пятровіч Воранаў і яго сын Міхаіл закатаваныя гітлераўцамі. Нацыстам, пры дапамозе правакатара, удалося высачыць Уладзіміра Амельянюка. Ён загінуў 26 мая 1942 года, было яму ўсяго 25.

Патрыёты гінулі – але кожнае слова «Звязды» сапраўды страляла ва ўпор. Па злачынцах-акупантах. Па халуях-здрадніках…

Пасля гібелі Амельянюка ўсе абавязкі па далейшым выданні газеты ўзялі на сябе Вячаслаў Нікіфараў, Ядвіга Савіцкая і Уладзімір Казачонак. У чэрвені 1942-га быў выпушчаны дадатковы тыраж першага нумара, каля 5 000 экзэмпляраў; падпольшчыкі абнавілі толькі зводку Савінфармбюро. Другі нумар газеты выйшаў толькі ў жніўні (а не ў ліпені, як намячалася): не хапала асобных літар, фарбы, прабельнага матэрыялу. Спатрэбілася шмат часу, каб здабыць усё неабходнае. Трэці нумар (6 верасня 1942 г.) быў прысвечаны ўсенароднай партызанскай вайне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Са старонак «Звязды» гучалі баявыя заклікі: «Настаў час свяшчэннай і бязлітаснай расплаты з крывавым ворагам. Да зброі кліча нас маці-Радзіма, кліча наша бальшавіцкая партыя!»

Падпольная «Звязда» шырока не толькі распаўсюджвалася ў Мінску і партызанскіх атрадах Міншчыны, але пры дапамозе чыгуначнікаў накіроўвалася ў іншыя гарады і вёскі Беларусі. Падпольшчыкі планавалі выпускаць газету тры-чатыры разы ў месяц, па нядзелях. Менавіта ў нядзелю, 20 верасня, выйшаў чацвёрты нумар «Звязды».

Гітлераўцы ўсе сілы кінулі на пошук рэдакцыі і падпольнай друкарні, прычым за гэтую інфармацыю была ўстаноўлена ўзнагарода ў паме-

ры 50 000 акупацыйных марак. Было задзейнічана мноства агентаў і правакатараў, аднаму з іх усё ж удалося высачыць патрыётаў. Пяты нумар «Звязды» планавалася выдаць 27 верасня 1942 года. Ужо ў пятніцу 25 верасня нумар быў набраны і звярстаны, пакінулі месца толькі для зводкі Інфармбюро аб становішчы на франтах, яе павінен быў запісаць па радыёпрыёмніку Вячаслаў Нікіфараў і ўвечары даставіць у друкарню. Але ў ноч на 26 верасня 1942 года гестапаўцы схапілі патрыёта, ён загінуў у Трасцянецкім лагеры смерці.

Журналіст Анатоль Мяснікоў сустракаўся з колішняй звяздоўкай-падпольшчыцай Ядвігай Савіцкай. У публікацыі «Слова клікала на барацьбу» прыведзены яе аповед: «У ноч на 26 верасня 1942 года нямецка-фашысцкія захопнікі арыштавалі 21 падпольшчыка, і сярод іх – усіх членаў падпольнага гаркама і сакратароў сталічных райкамаў партыі. Уладзімір Казачонак спачатку схаваў усе матэрыялы ў хляве ў двары дома, у якім я жыла, а потым іх вынеслі ў партызанскі атрад і пераправілі ў Маскву» [5].

Доўга лічылася, што ніякіх рукапісаў, па якіх набіралася падпольная «Звязда», не захавалася. У зборніку «Наша “Звязда”» (1968) гісторыкі С. Пачанін і В. Давыдава паведамілі, што пры грунтоўным вывучэнні Мінскага падполля ў партархіве Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ былі знойдзены арыгіналы рукапісаў двух нумароў – чацвёртага і пятага, падрыхтаванага, але не выпушчанага ў сувязі з арыштам падпольшчыкаў. «Гэтыя рукапісы пацвердзілі, што непасрэдна рыхтавалі газету, пісалі артыкулы, апрацоўвалі матэрыялы камуністы-падпольшчыкі В.С.Казачонак, А.А. Карпусенка і Я.М. Савіцкая» [6, с. 114].

Многія ўдзельнікі выпуску падпольнай «Звязды» загінулі ў страшэнных пакутах у душагубках, на шыбеніцах або ад варожай кулі ля турэмнай сцяны. У канцы 1942 г. было прынята рашэнне аднавіць выпуск газеты ў раёне размяшчэння камандавання Мінскага партызанскага злучэння на Загальскіх балотах, ва ўрочышчы Зыслаў Любанскага раёна Мінскай вобласці. Там дзейнічаў партызанскі аэрадром, выдаваліся адразу тры газеты – акрамя «Звязды», маладзёжная «Чырвоная змена» (газета пачала выдавацца ў красавіку 1921-га, з 2001 года выходзіць як дадатак да «Звязды») і любанская раённая газета «Кліч Радзімы». Рэдактарам «Звязды» стаў вопытны журналіст, даваенны рэдактар «Чырвонай змены» Міхаіл Барашкаў. Старонкі «Звязды»-партызанкі сведчаць аб тым, як партызанскі рух станавіўся ўсенародным, масавым; як партызанскімі станавіліся цэлыя беларускія вёскі...

Такім чынам, дакладнае, праўдзівае, адметнае публіцыстычнае слова можа быць не толькі справай, але і зброяй.



*Літаратура*

1. Будай, Г.В. Свинцом и словом: записки журналиста / Г.В. Будай – 2-е изд., испр. и доп. – Минск: Беларусь, 1981. – 223 с.
2. Дастанка, М.Е. Газета «Звязда» ў гады Вялікай Айчынай вайны (Чэрвень 1941 – май 1945 гг.) / М.Е. Дастанка. – Мінск: Выд. БДУ імя У.І. Леніна, 1970. – 196 с.
3. Кавалёў, П. Шчыры сябар газеты / П. Кавалёў // Наша «Звязда», 1917–1967 гг. / Склад. М.Я. Філімонаў. – Мінск: Беларусь, 1968. – С. 195–200.
4. Казачонак, У. Страляла ва ўпор / У. Казачонак // Наша «Звязда», 1917–1967 гг. / Склад. М.Я. Філімонаў. – Мінск: Беларусь, 1968. – С. 101–113.
5. Мяснікоў, А. Слова клікала на барацьбу / А. Мяснікоў. – Звязда. – 2002. – 21 мая. – С. 2.
6. Пачанін, С. У непакораным горадзе / С. Пачанін, В. Давыдава // Наша «Звязда», 1917–1967 гг. / Склад. М.Я. Філімонаў. – Мінск: Беларусь, 1968. – С. 113–118.